# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 4(46) 2005

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

## Змест

*Галоўны рэдактар:*
П. Дз. Кухарчык

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
І. Я. Леваш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў

*Гісторыя*

*Пуцік У. С.* Таварыствы сельскай гаспадаркі Паўночна-Заходняга краю ў канцы XIX — пачатку XX ст. (агляд матэрыялаў пасяджэнняў) ...... 3

*Груца І. А.* Гісторыя пошукаў «скарбаў Напалеона» на р. Бярэзіне ..... 8

*Мацеюк В. П.* Роль еўбюро пры ЦК КП(б)Б у паляпшэнні эканамічнага становішча яўрэйскага мястэчковага насельніцтва.................... 13

*Радаман А. А.* Ухвалы соймікаў і шляхецкіх з'ездаў Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў сістэме нарматыўнага рэгулявання фінансавання соймавых паслоў у другой палове XVI — пачатку XVII ст......16

*Сувалаў А. М.* Крытэрыі вызначэння этнічнай прыналежнасці беларусаў у славянскай гістарыяграфіі XIX — пачатку XX ст. ............... 21

*Мацюш П. А.* Гістарычная адукацыя ў сістэме вышэйшай школы Беларусі (1959—1975 гг.): гістарыяграфія і крыніцы ........................ 24

*Каспяровіч А. М.* Выкладчыцкія кадры сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Савецкай Беларусі 20-х гг. XX ст. ........................ 27

*Космач А. М.* Кенэдзі і Югаславія: асноўныя напрамкі знешнепалітычных падыходаў ............................................ 34

*Філасофія*

*Патоцкі А. А.* Асаблівасці інтэрпрэтацыі і разумення мастацкага тэксту ў постструктуралісцкай перспектыве ............................ 43

*Красюк У. Ф.* «Сфумата» Леанарда да Вінчы скрозь прызму метафізікі ................................................ 46

*Паліталогія*

*Ільін М. В.* Механізм рэалізацыі кадравай палітыкі дзяржаўнай службы ў Рэспубліцы Беларусь ...................................... 48

*Гілеўская Л. П.* Палітычныя тэхналогіі: падыходы, сутнасць, умовы ўжывання ............................................... 52

*Сацыялогія*

*Раманава С. П.* Інавацыйныя тэхналогіі выкладання сацыялогіі ...... 57

*Новікава С. І.* Фактары грамадзянскай сацыялізацыі моладзі ......... 60

*Князева К. І.* Сетка як арганізацыйны прынцып ...................... 64

*Эканоміка*

*Давыдзенка Л. М., Літвінюк А. І.* Стратэгія ўваходжання Рэспублікі Беларусь у сістэму трансгранічных сусветнагаспадарчых сувязей ...................................... 68

*Анісько А. Г.* Эмпірычная праверка трохкампанентнай мадэлі міжнароднага выбару прадпрымальніцкіх месц ............................ 76

*Савіна А. Ф.* Эвалюцыя мадэлей эканамічнага росту ................. 82

# ГІСТОРЫЯ

УДК 947.083:63

**У. С. Пуцік**

## ТАВАРЫСТВЫ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЮ Ў КАНЦЫ XIX — ПАЧАТКУ XX ст. (АГЛЯД МАТЭРЫЯЛАЎ ПАСЯДЖЭННЯЎ)

Царская самадзяржаўная ўлада ў Расіі ў пасляэформенны перыяд не прадугледжвала ніякай палітычнай волі і ў той жа час вымушана была мірыцца з неабходнасцю прадастаўлення (хаця і не ў поўным аб'ёме) свабоды эканамічнага развіцця. На гэтай аснове ў вытворча-эканамічнай сферы ўзнікалі разнастайныя аб'яднанні, мэтай якіх з'яўлялася як абарона карпаратыўных інтарэсаў гаспадароў-прадпрымальнікаў, так і садзейнічанне прагрэсу вытворчасці на аснове ўкаранення дасягненняў навукі, тэхнікі, перадавога вопыту гаспадарання.

У Беларусі, дзе земствы былі ўведзены толькі ў 1911 г., памешчыкі ва ўмовах буржуазнай трансфармацыі адчувалі асаблівую патрэбу ў аб'яднанні на глебе гаспадарча-эканамічных інтарэсаў. Пасля падаўлення паўстання 1863—1864 гг., якое ахапіла заходнюю частку імперыі, царскія ўлады ўвялі жорсткія абмежаванні ў адносінах дваран-католікаў. Нават па ўласных пытаннях збірацца групамі ім катэгарычна забаранялася. Такім чынам, пра дваранскія аб'яднанні не толькі палітычнага, але і эканамічнага характару на тэрыторыі Беларусі размовы не магло быць.

Пасля таго, як з цягам часу ўнутрыпалітычнае напружанне знізілася, а эканамічныя інтарэсы ва ўмовах развіцця капіталізму выклікалі неабходнасць пашырэння творчай прадпрымальніцкай дзейнасці, улады вымушаны былі рабіць некаторыя крокі насустрач грамадству. У сельскагаспадарчай галіне гэтаму садзейнічаў аграрны крызіс на мяжы 70—80 гг. XIX ст., які патрабаваў і ад памешчыкаў, і ад улад агульнымі намаганнямі шукаць з яго выхад.

Памешчыкі бачылі для сябе шляхі перадолення крызісу ў пераходзе ад збожжавай гаспадаркі да жывёлагадоўлі, укараненні тэхнічных культур, інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці на больш шырокіх рыначных капіталістычных адносінах, дасягненнях аграбіялагічнай навукі, перадавых метадаў вядзення гаспадаркі. Для гэтага яны адчувалі патрэбу ў аб'яднанні сваіх намаганняў на аснове стварэння сталадзеючых структур творчага характару.

Такімі аб'яднаннямі сталі таварыствы сельскіх гаспадароў. Для беларускіх губерняў іх значэнне было асабліва важным. У краі пасля рэформы 8,7 млн (50,5%) дзесяцін ворнай зямлі належала памешчыкам, палова з якой была сканцэнтравана ў памешчыцкіх латыфундыях (уладанне звыш 500 дзес.) [1, с. 51; 2, с. 60]. Менавіта памешчыкі-латыфундысты выступалі найбольш актыўнымі прыхільнікамі аб'яднання намаганняў дваранства Заходняга краю па вывадзе сельскай гаспадаркі з аграрнага крызісу.

Першым у краі з'явілася Мінскае таварыства сельскіх гаспадароў (МТСГ), створанае ў 1876 г. Ініцыяваў яго стварэнне Л. С. Макаў, былы міністр унутраных спраў, уладальнік маёнтка ў Мінскай губерні. У студзені 1877 г. адбылося адкрыццё таварыства віцебскіх сельскіх гаспадароў (ВіцТСГ), стварэнню якога садзейнічаў губернатар П. Я. Растоўцаў. У 1879 г. ствараецца таварыства ў Магілёўскай губерні (МагТСГ), у 1881 г. — у Віленскай (ВілТСГ). Ствараючы таварыствы сельскіх гаспадароў, Л. С. Макаў імкнуўся ў першую чаргу аб'яднаць новых гаспадароў зямельных уладанняў у Паўночна-Заходнім краі — прадстаўнікоў рускага дваранства.

Аднак, як палітык з вялікім вопытам, ён разумеў, што для работы на карысць краю няма іншага шляху, як вывучаць і ўлічваць мінулую культуру і мясцовыя традыцыі. Новая рэдакцыя статута 1878 г. не абмяжоўвала ўступленне ў таварыства ні па канфесіянальнай, ні па тэрытарыяльнай прымецы. Цяпер яно залежала толькі ад свядомага выбару.

Ідэя карпаратыўнасці, пазначаная статутам Мінскага таварыства, не вытрымала выпрабавання часам, і хутка памешчыкі «мясцовага» паходжання ўступаюць у таварыства, напаўняюць яго зместам мясцовай сельскай культуры і традыцыі. Э. А. Вайніловіч ва «Успамінах» падкрэсліваў, што за 25 гадоў дзейнасці таварыства многае змянілася. З 50—

70 членаў у 1876 г. яно вырасла да 700 чалавек у 1903 г. У арганізацыю прыходзілі тыя, хто прымаў і падзяляў ідэю дзейнасці таварыства і прынцыпы гонару, працы і праўды [3, с. 74].

Таварыствы ствараліся на добраахвотнай аснове і грамадскіх пачатках, з ініцыятывы саміх землеўладальнікаў. Таму варта адзначыць, што ў стварэнні таварыстваў галоўную ролю адыграла імкненне вывесці сельскую гаспадарку з крызісу, даць ёй магчымасць плённа развівацца. У праграмных арыенцірах, згодна са статутам таварыстваў, адзначалася, што яны ствараюцца дзеля збліжэння асоб, што займаюцца і цікавяцца сельскай гаспадаркай, дзеля спрыяння поспехам землеўладальніцкай прамысловасці, палёгкі ў збыце прадуктаў сельскай гаспадаркі. Ішоў пошук найбольш рацыянальных спосабаў вядзення гаспадаркі, распаўсюджання мадэрнізаваных машын і прылад, набыцця высокапрадукцыйных парод жывёлы і г. д. [4, с. 1—3; 5, с. 4; 6, с. 80].

Варта заўважыць, што таварыствы Беларусі абралі іншы вектар развіцця ў адрозненне ад падобных арганізацый Расіі, якія характарызаваліся аднабаковасцю, бо былі заняты ў асноўным навукова-агранамічнымі пытаннямі і насілі часткова акадэмічны характар. Мінскае ж таварыства, не ўпускаючы з віду тэарэтычнай распрацоўкі навукова-агранамічных пытанняў, прысвячала сваю працу практычнай дзейнасці. Пры ўзнікненні спрэчак на сходах «штораз пераважная большасць выказвалася за сукупнасць практыкі і тэорыі» [7, с. 9].

Вызначыць дакладна колькасныя паказчыкі дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў на тэрыторыі Беларусі ў храналагічных рамках даследавання цяжка ў сувязі з адсутнасцю верагодных статыстычных даных. У пачатку XX ст. на тэрыторыі краю таварыствы існавалі ў кожным губернскім і павятовым цэнтрах, а з 1908 г. ужо і ў паветах ішло актыўнае арганізацыйнае будаўніцтва валасных сельскагаспадарчых таварыстваў, гурткоў, арцелей. У 1913 г. у пяці беларускіх губернях налічвалася 212 сельскагаспадарчых аб'яднанняў [8, с. 75].

Колькасць членаў у павятовых таварыствах, як правіла, была невялікай, у межах 50 чалавек, у дробнараённых таварыствах колькасць членаў налічвалася менш чым 50 і вагалася ад 20 да 37. Паводле сацыяльнага статусу, ва ўсіх павятовых арганізацыях пераважалі землеўладальнікі і часткова асобы інтэлігентных прафесій (мясцовыя святары, настаўнікі, урачы), у дробнараённых жа таварыствах пераважалі сяляне [9, с. 4—6].

Быць абраным у сапраўдныя члены губернскіх таварыстваў, згодна са статутамі, магла «любая асоба не маладзей 21 года, працуючая ў галіне сельскай гаспадаркі, а таксама зацікаўленая ёю», «у члены маглі быць абраны і асобы жаночага полу». Абранне новых членаў праводзілася па пісьмовых прапановах двух-трох сапраўдных ці ганаровых членаў таварыства. Колькасны склад арганізацыі не абмяжоўваўся. Членства ў таварыствах улічвала штогадовы абавязковы ўзнос у памеры 5 рублёў — Віцебскае, 10 — Мінскае. Існаваў уступны ўзнос памерам у 5 рублёў [4, с. I, V; 5, с. 5].

Губернскія таварыствы сельскіх гаспадароў да пачатку XX ст. уяўлялі ўплывовыя грамадска-эканамічныя структуры ў краі. Як правіла, іх членамі былі буйныя землеўладальнікі, што працавалі ў сельскай гаспадарцы. Колькасны склад МТСГ у пачатку стагоддзя быў наступным: у 1901 г. — 701 сапраўдны член [7, с. 74]; ВіцТСГ у 1900 г. — 409 [10, с. 5—16]; МагТСГ у 1910 г. — 214 [11, с. 1]; ГродзТСГ у 1903 г. — 233 чалавек [12, с. 130].

Статуты губернскіх таварыстваў прадпісвалі праводзіць не менш двух агульных сходаў на год, але, як правіла, іх штогод праходзіла ад трох і больш. Для кіраўніцтва ўсімі бягучымі справамі таварыстваў абіраліся саветы, што складаліся са старшыні, віцэ-старшыні, сакратара, казначэя і некалькіх членаў. Савет Мінскага таварыства збіраўся раз на месяц, але для розных экстраных выпадкаў колькасць пасяджэнняў на год павялічвалася. У якасці пастаяннадзеючага органа таварыства выступаў сакратар.

Паступальнае развіццё МТСГ, пашырэнне кола разгледжаных пытанняў, што тычыліся розных галін сельскай гаспадаркі, значнае павелічэнне колькасці яго членаў да сярэдзіны 90-х гг. выклікала сітуацыю, калі агульныя сходы не ў стане былі спраўляцца на сваіх пасяджэннях з матэрыяламі, назапашанымі паміж сходамі, што патрабавала стварэння спецыялізаваных камісій. Дзесяткі часовых камісій і секцый, што нагадвалі таварыствы ў мініяцюры, таксама не здолелі задаволіць патрабаванні таварыства, і многія з іх прынялі сталы характар. У 1901 г. пры таварыстве ўжо працавалі шэсць секцый.

Старэйшай па часе заснавання з'яўлялася вінакурная секцыя (старшыня Я. І. Любаньскі), што ўздымала шмат пытанняў, якія мелі першаснае значэнне для адной з важнейшых галін сельскагаспадарчай прамысловасці. Гэтай секцыі належала ініцыятыва стварэння таварыства вінакурных заводчыкаў.

У 1884 г. узнікла лясная секцыя, якой да 1901 г. кіравалі С. К. Свянціцкі, В. О. Цюндзевіцкі, І. С. Гаргліновіч. Секцыя ажыццяўляла кіраўніцтва лясным бюро па ўладкаванні планаў ляснай гаспадаркі і таксацыі лясоў, выпрацоўвала ўмовы аўкцыённага продажу лесу, ініцыіравала хадайніцтва аб падтрымцы і паляпшэнні Бярэзінскай сістэмы і шмат інш.

У наступным годзе ствараецца агранамічная секцыя пад кіраўніцтвам О. Ю. Свіды. Асаблівай увагі заслугоўвалі даследаванні аб уздзеянні на палі і лугі штучных угнаенняў, усялякія конкурсы і экскурсіі. Паводле прапановы А. А. Тарчынскага, была заснавана секцыя жывёлагадоўлі, а потым, згодна з праектам Б. Грабоўскага, секцыя рабочай конегадоўлі. Абедзве секцыі, акрамя тэарэтычных распрацовак па жывёлагадоўлі, прысвяцілі шмат часу практычным справам: арганізацыі і ўдзелу ў выстаўках, рынках, стварэнні радаслоўных кніг племянной жывёлы, адкрыццю ў Варшаве крамы для збыту малочных прадуктаў.

У 1900 г. ствараецца Палескае аддзяленне МТСГ, сход членаў якога праходзіў у Пінску. Мясцовыя ўмовы Палесся патрабавалі асаблівых мерапрыемстваў. Палескае аддзяленне пад энергічным і ўмелым кіраўніцтвам князя Г. Э. Друцкага-Любецкага і пры супрацоўніцтве К. Х. Шчыта займалася распрацоўкай пытанняў асушкі балот.

У канцы XIX ст. на пасяджэннях аддзяленняў таварыстваў дэбатаваліся надзённыя навуковыя пытанні, прачытваліся рэфераты і паведамленні на разнастайныя сельскагаспадарчыя тэмы. Агульныя ж сходы прысвячалі свой час разгляду спраў таварыства і тых рэфератаў, што адпаведным аддзяленнем прызнаны асабліва важнымі паводле навізны светапогляду, характэрнай асаблівасці напрамку дадзенай галіны сельскай гаспадаркі. Згодна з вышэйадзначанай схемай, у канцы XIX — пачатку XX ст. працавалі ўсе губернскія сельскагаспадарчыя таварыствы Беларусі [7, с. 9, 18—27].

У 1901 г. Э. А. Вайніловіч, падводзячы вынікі 25-годдзя МТСГ, адзначаў: «Сёння ўсё здаецца ясным і простым, але гэтых вынікаў мы дамагліся з вялікай працай і дзякуючы таму, што 1) наша Таварыства ніколі не пераступала межы свайго рэгламенту, не мела і не ставіла чужых яму задач; 2) дзейнічала адпаведна сваім сілам і магчымасцям; 3) кансалідавала сілы для выканання прынятых рашэнняў; працэс дэцэнтралізацыі пачаўся ў апошні час, калі таварыства стала вялікім і магутным; 4) заўсёды і паўсюдна таварыства лічыла сябе прадстаўніком памешчыкаў Заходняга краю, захоўвала і памнажала традыцыі гонару і годнасці, дабрыню гэтага краю» [3, с. 74].

Старшыня МТСГ канстатаваў: «Сельскагаспадарчае таварыства было для нас падрыхтоўкай да грамадскага жыцця. На працягу 25 гадоў мы дзейнічалі заўсёды ў згодзе з нашай праграмай і шмат чаму навучыліся. Я не думаю, што хто-небудзь можа сумнявацца ў тым, што мы выспелі для земскіх устаноў, якія зроблены па прынцыпе раўнапраўя...» [3, с. 74]. З 1878 г. таварыствы паступова ператвараліся ў аб'яднанні польскіх землеўладальнікаў краю. З дапамогай гэтых грамадскіх арганізацый польскія памешчыкі значна ўзмацнілі свой уплыў на эканамічнае жыццё Беларусі, што ў сваю чаргу ўмацавала іх грамадска-палітычныя пазіцыі як у краі, так і ў імперыі ў цэлым.

Тагачасныя прадстаўнікі расійскай адміністрацыі ў краі адзначалі, што захаванне зямлі ў польскіх руках абвяшчаецца ў Беларусі і Літве «нацыянальным абавязкам» кожнага паляка, што арганізацыя памешчыцкага класа з гэтай мэтай праводзілася ў так званых «зямельных сіндыкатах», у «Таварыствах пазямельнага крэдыту» і інш., якія пакрылі Беларусь густой сеткай і мелі свае філіі ва ўсіх губернскіх, а часам і павятовых гарадах. Менавіта тут польскі памешчык у Беларусі знаходзіў сабе аб'яднанне, узаемную падтрымку, тут ён агаворваў сваю тактыку. Дарэмна расійская адміністрацыя пільна сачыла за ім, каб у «Пазямельных таварыствах» не звівала сабе гнязда ненавісная «пальшчызна»: яны ўсё ж былі падобнымі «гнёздамі».

У тагачаснай расійскай прэсе знаходзім шмат скаргаў на тое, што палякі пайшлі ў наступленне і захапілі ў свае рукі справу народнай гаспадаркі ў краі. «Віленскі пазямельны банк прымае пад заклад выключна польскія маёнткі, — піша адзін з «обрусителей», — трымае ў сваіх руках усе зямельныя багацці дзевяці заходніх губерняў і стаіць на варце польскіх інтарэсаў краю. На банк гэты нельга глядзець як на камерцыйнае прадпрыемства. Ён з'яўляецца самай буйной палітычнай сілай у краі, і галоўная яго задача — захаваць польскія маёнткі ў польскіх руках» [13, с. 266].

Як палітычныя аб'яднанні сельскагаспадарчыя таварыствы заяўляюць пра сябе, калі прымаюць удзел у так званых «акруговых з'ездах» 1880—1881 гг., што склікаліся па ініцыятыве М. Лорыс-Мелікава, які паспрабаваў прыцягнуць да абмеркавання дзяржаўных спраў земцаў. З прычыны адсутнасці земстваў у Беларусі, на акруговы з'езд у Смаленск ад

грамадскасці Паўночна-Заходняга краю былі накіраваны прадстаўнікі ад МСГТ польскія землеўладальнікі В. Свіда і Э. Вайніловіч, ад Магілёўскай губерні — А. Сенажэнцкі і І. Мянжынскі [3, с. 41].

У 90-х гг. XIX і ў пачатку XX ст. сельскагаспадарчыя таварыствы прымаюць актыўны ўдзел у грамадскіх справах, якія тычыліся пытанняў аграрнага заканадаўства, самакіравання, вырашэння наогул аграрнага пытання. Так, прадстаўнікі СГТ у 1891 г. прынялі ўдзел у ініцыіраваным МУС Асобым пасяджэнні па пытанні аб скасаванні хібаў, што чыняцца прыватнаму землеўладанню ў Заходнім краі, прадстаўленымі ў гэтай мясцовасці сялянам сервітутнымі правамі на ўладальніцкіх землях. Губернскім па сялянскіх справах прысутнасцям было прапанавана выпрацаваць праекты правіл пра абавязковую замену сялянскіх сервітутаў [14, л. 1 аб].

Тэма сервітутаў, ініцыіраваная ў 1891 г. МУС, неаднаразова разглядалася, дакладвалася і дэбатавалася Таварыствамі сельскіх гаспадароў. У МТСГ у 1876—1901 гг. па гэтым пытанні выступілі з дакладамі Э. А. Вайніловіч («Сервітуты і іх развярстанне»), Я. Лісоўскі («Пра сервітуты»), І. Масальскі («Пра сервітуты»). Так, для хуткага вырашэння гэтага пытання граф К. Э. Чапскі ў дакладзе, прачытаным на агульным сходзе таварыства 12.12.1893 г., прапаноўваў «высветліць: папершае, памеры існуючых цяпер сервітутаў (межы, колькасць дзесяцін, колькасць жывёлы і інш.); па-другое, норму ўзнагароджання пры абавязковай развёрстцы; па-трэцяе, намеціць арганізацыю і парадак дзеянняў тых усталяванняў ці органаў, на якія будзе ўскладзена прывядзенне ў выкананне ліквідацыя сервітутаў, абраць камісію Таварыства і прасіць яе скласці праект развёрсткі да наступнага сходу» [15, л. 7].

Пастанова агульнага сходу была выканана, і ўжо 06.03.1894 г. камісія ў складзе графа К. Э. Чапскага, графа В. С. Тацішчава, В. К. Масальскага, І. І. Кукевіча, С. К. Свянціцкага, Б. В. Ратынскага, С. І. Багдашэўскага і К. М. Гардзялкоўскага прапанавала сваё меркаванне для вырашэння пытання. Старшыня камісіі В. К. Масальскі зрабіў падрабязны даклад «Пра неабходнасць замены сервітутаў адпаведным зямельным узнагароджаннем сялян у памеры 1/6—1/8 агульнай сервітутнай прасторы». Паводле меркавання дакладчыка, «развярстанне сервітутаў будзе ў Паўночна-Заходнім краі істотным дадаткам да вялікай сялянскай рэформы. Пры спрыяльных умовах з развярстаннем сервітутаў можна справіцца ў 2—3 гады. У Мінскай губерні з агульнай лясной прасторы 1.500.000 дзес. 3/4 яе ў 1100 фальварках, гэта значыць 1125000 дзес. знаходзіцца пад сервітутамі, і на долю сялян пры развярстанні адыдзе каля 100000 дзес.» [16, л. 8]. Як паведамляюць пратаколы, сход адзінадушна падзякаваў дакладчыку і пастанавіў узбудзіць ва ўрадавых сферах хадайніцтва пра найбольш хуткае развярстанне сервітутаў на пачатках, пра якія адзначалася ў дакладзе камісіі. Праекты скасавання сервітутаў, выпрацаваныя В. К. Масальскім і Э. А. Вайніловічам, Мінскім таварыствам былі прадстаўлены ўраду.

Неаднаразова ў таварыствах абмяркоўвалася праблема паляпшэння дробнай сялянскай гаспадаркі і побыту сельскагаспадарчых рабочых, заснаванне сталай урачэбнай дапамогі сельскагаспадарчым працоўным і служачым. Б. Грабоўскі ў сваім дакладзе адзначае, што часткова гэты праект ажыццяўляўся ў Мінскай губерні, вядомая група суседзяў-памешчыкаў разам запрашаюць урача, які перыядычна аб'язджае іх фальваркі і аказвае хворым дапамогу [7, с. 9].

Сялянскае пытанне ў пачатку XX ст. вырастала ў больш складанае і агульнае аграрнае пытанне. Сялянскае малазямелле вызначалася як галоўная прычына збяднення. Клопаты аб выпраўленні сялянскіх палажэнняў змяніліся клопатамі аб уздыме сельскагаспадарчай вытворчасці. Сялянскае пытанне са сферы юрыдычнай перайшло ў сферу эканамічную [17, с. 186].

Спробы ўрада ў пачатку XX ст. яшчэ раз звярнуцца да аграрнага пытання ўзрушылі сельскагаспадарчую грамадскасць у беларускіх губернях. Сельскагаспадарчыя таварыствы краю прынялі актыўны ўдзел у работах Асобай нарады для высвятлення патрэб сельскагаспадарчай прамысловасці (пад кіраўніцтвам С. Ю. Вітэ) і Рэдакцыйнай камісіі МУС. Аднак трэба адзначыць, што дадзенае пытанне абмяркоўвалася на сходах сельскагаспадарчых таварыстваў і на старонках газет. Не выклікаў сумнення факт пагаршэння стану сялянскай гаспадаркі. Больш таго, аграрныя хваляванні 1905 г., якія ахапілі тэрыторыю Беларусі, прымусілі больш дэталёва і прынцыпова яшчэ раз звярнуцца да пошуку шляхоў вырашэння праблемы. Прычыны пагаршэння і заняпаду сялянскай гаспадаркі, а значыць і прапановы вырашэння праблемы, бачыліся разнастайныя.

Вынікі абмеркаванняў аграрнага пытання ў асяроддзі памешчыкаў беларускіх губерняў

увайшлі ў праграму МТСГ, выпрацаваную камісіяй, у склад якой увайшлі: Э. А. Вайніловіч, М. Г. Валовіч, І. І. Віткевіч, А. М. Гардзялкоўскі, І. Э. Друцкі-Любецкі, К. М. Дземідэцкі-Дземідовіч, Е. Л. Кавалеўскі, У. Б. Крупскі, В. Р. Лопат, М. А. Ленскі, Е. І. Любанскі, К. К. Незабытоўскі, К. К. Прашынскі, Ф. В. Сціда, Р. А. Скірмунт і Г. Э. Чапскі. Праграма прадугледжвала паляпшэнне стану сялянскай гаспадаркі, усталяванні ўсесаслоўнай воласці, знішчэнні беззямелля і малазямелля без парушэння прынцыпу прыватнай уласнасці, паляпшэнні спосабаў апрацоўкі зямлі, палягчэнні пакупкі зямлі пры дапамозе шырокага народнага крэдыту, упарадкаванні землеўладання і землекарыстання, ліквідацыі калектыўнага землеўладання, спыненні сялянскага надзельнага выкупнога плацяжу, устараненні неадукаванасці сялян. [18, с. 20—31].

5 сакавіка 1906 г. на чарговым пасяджэнні агульнага сходу МТСГ выступіў з вялікім дакладам (амаль 70 старонак машынапіснага тэксту), прысвечаным тэме аграрнага пытання, Г. Свянціцкі. У дакладзе разглядаліся гісторыя пытання ў Паўночна-Заходнім краі, праграмы ўрада, палітычных партый і іх крытыка. Ён абвяргаў усе праекты аграрных рэформ, якія прадугледжвалі прымусовае адчужэнне памешчыцкай зямельнай уласнасці. Шляхі рашэння аграрнага пытання ў краі дакладчыку бачыліся ў магчымасці сялян свабодна купляць, прадаваць, закладваць сваю зямлю, хаця бы з абмежаваннем пераходу зямлі толькі ў рукі сялянскага саслоўя, у танным крэдыце, усталяванні на базе дзяржаўных, казённых і ўдзельных зямель пры дапамозе Сялянскага банка дзяржаўнага зямельнага фонду, наладжванні работ землеўпарадкавальных камітэтаў [19, с. 4—5].

У якасці прынцыповага сродку вырашэння аграрнага пытання прапанавалася «ўвядзенне самага шырокага мясцовага самакіравання» [20, с. 70], «устанаўленне законам прыватнай зямельнай уласнасці» [20, с. 63], выхаванне ў грамадстве і ў першую чаргу сярод сялян паняцця права ўласнасці. Г. Свянціцкі зрабіў вывад, што не трэба чакаць павагі да чужой уласнасці там, дзе адсутнічае павага да чалавечай годнасці, чаго ў сваю чаргу нельга чакаць там, дзе няма свабоды сумлення, слова, саюзаў, а таксама роўнасці ўсіх перад законам [20, с. 65].

Перадвыбарная барацьба і дзейнасць Расійскай Дзяржаўнай думы першага склікання паднялі аграрнае пытанне на новую ступень. Дума вызначыла аграрную праблему галоўным пытаннем унутранай палітыкі краіны. Палеміка па галоўным пытанні разгарнулася ў сродках масавай інфармацыі ўсіх кірункаў: ліберальнага, кансерватыўнага, правага; беларуска-, польска- і рускамоўнага. Тон задавалі газеты «Голос провинции», «Могилевский вестник», «Свободное слово», «Северо-западный голос», «Gazeta Wileńska», «Kurjer Litewski». Пытанні, узнятыя ўрадам, Дзяржаўнай думай, сельскагаспадарчымі таварыствамі, ужо праз дзень-два знаходзілі водгукі ў друку. Прынцыповымі заставаліся тэмы сялянскага малазямелля, прыватнай зямельнай уласнасці і яе адчужэння, мясцовае самакіраванне. [21—26].

Сельскагаспадарчыя таварыствы краю ў гэты перыяд звязваюць вырашэнне аграрнай справы не толькі на заканадаўчым узроўні, але спрабуюць уплываць на сялянства непасрэдна праз узаемадзеянне з ім. Да такіх форм неабходна аднесці спробы стварыць аддзяленні пры сельскагаспадарчых таварыствах, у якіх маглі прымаць удзел сяляне. Так, у гэты перыяд былі створаны аддзяленні Палескае, Слуцкае, Глускае, Навагрудскае, Бабруйскае, Мазырскае, Барысаўскае і інш [19, с. 14; 27, с. 5]. Віленскае сельскагаспадарчае таварыства на сваіх пасяджэннях неаднаразова разглядае «пытанні аб арганізацыі ў вёсках сельскагаспадарчых гурткоў, якія павінны быць занятыя ў вырашэнні практычных пытанняў» [21, с. 3]. У пачатку 1906 г. пачалася праца па стварэнні сельскагаспадарчых гурткоў у Віцебскай і Гродзенскай губернях. На думку арганізатараў, гурткі павінны былі спрыяць уздыму сельскай гаспадаркі праз апеку сялянскіх гаспадарак.

Вынікі стварэння і дзейнасці ТСГ у Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. сведчаць аб тым, што павелічэнне ролі сацыяльных пытанняў у грамадска-палітычным жыцці краю абвастрылася як у сувязі з пошукамі сельскагаспадарчымі вытворцамі практычных шляхоў уздыму сельскай гаспадаркі ў гэтыя гады, так і праз прыцягненне ўрадам розных грамадскіх аб'яднанняў да ўдзелу ў распрацоўцы дзяржаўных праграм вырашэння сацыяльных праблем. Пры гэтым, хоць планы ўрадавых колаў абмяжоўваліся далучэннем прадстаўнікоў грамадскасці да разгляду канкрэтных пытанняў развіцця сельскай гаспадаркі, удзел у іх абмеркаванні прадстаўнікоў ТСГ з'яўляўся важным фактарам фарміравання грамадскай думкі ў больш шырокім плане.

У Беларускім краі палітызацыя дзейнасці ТСГ ажыццяўлялася ў большай ступені, чым у

цэнтральных расійскіх губернях, у сувязі з яго гістарычнымі асаблівасцямі, якія былі звязаны з панаваннем тут польскага элемента ў дваранскім асяроддзі, а таксама з больш высокім узроўнем развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Так паступова, але няўхільна, у самадзяржаўнай Расіі яшчэ перад рэвалюцыяй 1905—1907 гг. ажыццяўлялася фарміраванне элементаў грамадзянскага грамадства. Беларусь у гэтым плане была адным з найбольш актыўных рэгіёнаў.

Літаратура і крыніцы


1. *Бусько В. Н.* Экономическая мысль Белоруссии середины XIX — начала XX в. : очерки. Мн., 1990.
2. Эканамічная гісторыя Беларусі / под общ. ред. В. І. Галубовіча, Р. І. Ермашкевіча, Г. П. Бушчык і інш. Мн., 1996.
3. *Woyniłłowicz Edward.* Wspomnienia. 1847—1928. Wilno, 1931.
4. Труды Первого областного съезда сельских хозяев в г. Двинске в 1903 г. Витебск, 1904.
5. Устав Минского общества сельского хозяйства. Утв. 20. Авг. 1876 г. Спб., 1877.
6. *Бацяеў В. Ф.* Грамадскія сельскагаспадарчыя аб'яднанні беларусаў у XIX ст. // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2000. № 2. С. 79—84.
7. *Грабовский Б. С.* Краткий очерк двадцатипятилетней деятельности Минского общества сельских хозяев, состоящего под августейшим покровительством... великого князя Владимира Александровича. Мн., 1901.
8. Беларусы. Т. 6. Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў, В. М. Бялявіна, А. У. Гурко [і інш.]; Мн., 2002.
9. *Яновский И. В.* Краткий обзор деятельности сельскохозяйственных обществ в Могилевской губернии за 1915 г. Могилев, 1918.
10. Отчет о действиях Общества витебских сельских хозяев и состоящих в его ведении земледельческих кружков за 1900 г. Витебск, 1901.
11. Отчет могилевского общества сельского хозяйства за 1910 г. Могилев, 1911.
12. Обзор Гродненской губернии за 1903 год. Гродно, 1904.
13. *Цвікевіч А.* «Западно-руссизм» : нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. 2-е выд., Мн., 1993.
14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), ф. 242, воп. 1, спр. 2485.
15. Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 12 дек. 1893 г. Мн., 1893.
16. Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 6 марта 1894 года. Мн., 1894.
17. Великая реформа: Русское общество и крестьянский вопрос в прошлом и настоящем. В 6 т. М., 1911. Т. 6.
18. Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 25—26 сентября 1905 года. Мн., 1905.
19. Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 5—6 марта 1906 года. Мн., 1906.
20. *Свенцицкий Г. И.* Аграрный вопрос. Доклад Г. И. Свенцицкого Минскому сельскохозяйственному Обществу 5 марта 1906 г. : пер. с польск. СПб., 1906.
21. В Виленском обществе сельского хозяйства // Свободное слово. 1906. 19 сент.
22. По Северо-Западному краю // Могилевский вестник. 1906 г. 15 июня.
23. *Фризендорф Т.* К аграрному вопросу // Голос провинции. 1906. 13 авг.
24. *Lopacinski S.* Sprawa włościańska na Litwe i Białoj Rusi // Gazeta Wilenska. 1906. 2.03
25. *Dymsza H.* Poslowie nasi o sprawie agrarnej // Kurjer Litewski. 1906. 9.05.
26. *Skirmunt R.* Poslowie nasi o sprawie agrarnej // Kurjer Litewski. 1906 9. 05.
27. Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 10 декабря 1906 года. Мн., 1907.



Summary

*The article dwells on the problems connected with association activities of rural masters of north-western Kraj at the end of the XIX-th and the beginning of the XX-th centuries.*

*Much attention is being paid to revealing of subject initiating and members' participation in formation of civil consciousness and civil society in Belarus, of their economic and political activity.*


---

*УДК 947.072.5*

***І. А. Груца***

# ГІСТОРЫЯ ПОШУКАЎ «СКАРБАЎ НАПАЛЕОНА» НА Р. БЯРЭЗІНЕ

Сваім узнікненнем тэрмін «скарбы Напалеона» абавязаны рабаванню Масквы войскамі Вялікай арміі падчас Айчыннай вайны 1812 г. Паколькі старажытная сталіца Рускай дзяржавы была здадзена без бою, гарадскія ўлады не паспелі поўнасцю эвакуіраваць вялікія каштоўнасці, якія захоўваліся ва ўрадавых установах і праваслаўных храмах маскоўскага Крамля [1, л. 18].

Пакуль у Напалеона заставалася надзея на заключэнне міру з расійскім імператарам Аляксандрам І, ён не дазваляў рабаваць